

Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

№53 (186). 28 снежня 2000г. — 3 студзеня 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 110 руб.

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Сённяшні нумар нашай газеты крыху патаўсцеў. Улічваючы пажаданні многіх чытачоў, мы пачынаем рабіць забаўляльны ўкладыш "Дэсерт". Пакуль ён будзе выходзіць адзін раз на месяц. На яго старонках будуць змяшчацца не толькі сканворды, якія пагадзіўся рыхтаваць слонімец Аляксандр Захарчук, але анекдоты, карыкатуры і іншыя матэрыялы. Вашы пажаданні, заўвагі, а таксама цікавыя допісы для "жоўтай старонкі" можаце дасылаць на адрас рэдакцыі.

НАВІНЫ

А як хочацца жыць добра

Матэрыяльнае становішча большасці жыхароў Беларусі сёння вельмі складанае, але асабліва пакутуюць ад недахопу грошай пенсіянеры. Толькі ў Слоніме і Слонімскім раёне іх налічваецца каля 20 тысяч чалавек.

Сярэдняя пенсія за снежань 2000 года склала каля 36 тысяч рублёў. Кожны месяц сталыя людзі спяшаюцца ў паштовыя аддзяленні, каб атрымаць свае невялікія сумы.

Вольга ШЫНКЕВІЧ

Смяротную кару замянілі на пажыццёвае зняволенне

26-гадоваму Уладзіміру Расолу смяротная кара заменена на пажыццёвае зняволенне асобага рэжыму. Такое рашэнне вынес Вярхоўны суд Беларусі 22 снежня пасля разгляду апеляцыі.

Прысуды іншым удзельнікам злачынства: Анатолю Зенаву, Сяргею Крынчыку і Сяргею Новікаву былі пакінуты без змянення.

Нагадаем, што ўсе яны асуджаны за забойства слонімцаў Віталя Хамякова і Анатоля Фідрыка.

Валодзя ЯНЧУК

ЗДАРЭННІ

Неожиданная смерть

В Гродно, 20 декабря, в "неотложке", при доставке из гостиницы "Турист" в больницу скорой медицинской помощи, скоропостижно скончался гражданин Дании, директор фирмы "Кови". Предварительный диагноз — инфаркт миокарда.

Иностранец приехал из города Теле в Гродно для участия в конференции по охране окружающей среды.

Ася КУНИЦКАЯ

ШЧУПАК ДА НАВАГОДНЯГА СТАЛА



Фота Віталя Гіля

У панядзелак, 25 снежня, у рэдакцыю нашай газеты завітаў слонімец Мікалай Казакевіч. Ён прынёс паказаць шчупака, якога злавіў у той жа дзень у затоцы Шчары ў раёне Савецкай вуліцы.

Шчупак быў яшчэ жывы і моцна біўся хвастом. Падвесіўшы рыбіну на вагі, мы былі здзіўлены — улоў Мікалая Казакевіча заважыў роўна 6 кілаграмаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

АНОНС

ДЕПУТАТЫ ХОТЯТ ИМЕТЬ СВОЙ БЮДЖЕТ И СВОЮ БУХГАЛТЕРИЮ

СТР. 4

ПРАЦЯГ ДЭТЭКТЫЎНАГА АПАВЯДАННЯ "ГАДЗІННІК"

СТР. 6


АКЦЫЯ

ЯЗЭП СТАБРОЎСКІ — САМЫ знакаміты слонімец XX стагоддзя

На працягу месяца "Газета Слонімская" праводзіла акцыю "Слонімец XX стагоддзя", мэтай якой было вызначэнне найбольш знакамітага нашага земляка адыходзячага стагоддзя.

У акцыі прынялі ўдзел каля ста чытачоў нашай газеты, якія прапанавалі кандыдатуры па тэлефоне, у пісьмовай форме і па электроннай сувязі. Усяго называўся 21 чалавек: паэты Мікола Арочка, Алег Лойка, Сяргей Новік-Пяюн, Іван Карповіч, Валянцін Таўлай, Гальяш Леўчык, краязнавец і паэт Васіль Супрун, краязнаўцы Язэп Стаброўскі, Аляксандр Жукоўскі, Міхаіл Рылко, літаратуразнаўца Янка Саламевіч, святары Вітольд Жэльветра і Антон Неманцэвіч, спартсмены Уладзімір Раманоўскі і Іван Ціхан, сусветна вядомы медык Андрэй Пракапчук, чыноўнікі Васіль Пеляніцын і Віктар Чорны, палітык Іван Бядко, дырэктары прадпрыемстваў Алег Бярдула і Уладзімір Гавенька.

Найбольш галасоў нашых чытачоў набраў Язэп Стаброўскі (1870 – 1968). Менавіта ён, на думку нашых землякоў, і з'яўляецца самым знакамітым слонімцам XX стагоддзя.



Славуты слонімскі краязнавец, гісторык, філосаф, археолаг, вайсковец Язэп Стаброўскі ў 1929 годзе, дзякуючы ўласнай калекцыі, адкрыў у Слоніме краязнаўчы музей. А ў 1939 годзе перадаў усе свае музейныя экспанаты ў дар нашаму гораду.

Язэп Стаброўскі напісаў дзесяткі навуковых прац. Сярод іх — "Каменны век на Слонімшчыне і ў суседніх рэгіёнах", "Праваслаўе, каталіцызм і унія. Іх узаемаадносіны на Слонімшчыне" і іншыя.

Язэп Стаброўскі з'яўляецца аўтарам двух вынаходніцтваў. Ён вынайшаў шрапнель удасканаленага ўзору (зацверджана ў 1907 годзе Галоўным артылерыйскім упраўленнем), а таксама тэлефон-прыёмнік удасканаленай канструкцыі (польскі патэнт №18728).

Незадоўга перад II сусветнай вайной Язэп Стаброўскі перадаў сваім землякам-сялянам у вёсцы Орлавічы ўласны маёнтак і зямлю.

Язэп Стаброўскі — кавалер шасці ордэнаў, быў узнагароджаны шматлікімі граматамі і дыпломамі.

Па выніках нашага апытання Язэп Стаброўскі прызнаны сваімі землякамі самым знакамітым слонімцам адыходзячага стагоддзя. Цяпер — справа за намі, каб ушанаваць гэтае імя ў нашай гісторыі.

акцыя "слонімец XX стагоддзя" ● акцыя "слонімец XX стагоддзя" ● акцыя "слонімец XX стагоддзя" ● акцыя "слонімец XX стагоддзя"

ОПРОС

"НА ЧТО ВЫ НАДЕЕТЕСЬ В НОВОМ ГОДУ?"

С таким вопросом в канун Нового года корреспондент "ГС" обратилась к слонимчанам. Ответы были разные. Но одно, что бесспорно объединяет наших людей, — это надежда на лучшее.

Евгений, *безработный:*

— Я надеюсь только на хорошее. В новом году хотел бы поменять имидж. От своих друзей я жду хороших подарков.

Елена, Светлана, Оксана, Вика, *студентки Слонимского медучилища:*



— Мы все надеемся на лучшую жизнь. Хотелось бы денег побольше, так как у студентов их постоянно не хватает. Еще хотелось бы пожелать всем здоровья.

Наталья Дружкова, Валентина Шурко, *учащиеся:*

— В новом году все должно быть к лучшему. Хотелось бы поступить в институт. Чтобы наше общество изменилось, чтобы люди были добрее.

Татьяна:



— Пусть у нас в семье будет все благополучно, пусть все будут здоровыми. Еще я надеюсь на продвижение на работе.

Александр Андреевич Гладиков, Петр Петрович Мощук, *военнослужащие:*

— Чтобы лучше в армии служилось, надеемся на скорый дембель.

Владимир Казимирович Хилимончик, Николай Суравей, *безработные:*

— Ничего хорошего в новом году мы не ждем. А что может быть хорошего? Цены растут, а зарплата не увеличивается. Хотелось бы, чтобы жизнь изменилась, чтобы люди были обеспечены работой и, соответственно, чтобы зарплата была выше.

(Продолжение на 2 стр.)

ПРОГНОЗ ПОГОДЫ по Гродненской ОБЛАСТИ

27 ДЕКАБРЯ облачно. Днем местами небольшой мокрый снег, в отдельных районах туман, ветер переменный 2-7 м/с. Температура воздуха ночью -1-6, днем +2-3.

28–29 ДЕКАБРЯ облачно с прояснениями.

28 декабря ночью и днем 29 декабря преимущественно без осадков. Днем 28 декабря и ночью 29 декабря временами мокрый снег. Местами туман, гололед, ветер южный 5-10 м/с. Температура 28 декабря ночью 0-5 мороза, днем +2-3, 29 декабря ночью и днем -3+2.

Облгидрометеоцентр

НАВІНЫ

Слонімец у дзесятцы лепшых шашыстаў свету

Як ужо паведамляла "ГС", слонімец Віталь Аніська выступаў на чэмпіянаце свету сярод юніёраў у Бразіліі. У аўторак, 26 снежня, ён вярнуўся ў Беларусь.

На чэмпіянаце свету наш зямляк заняў сёмае месца і ўвайшоў у дзесятку самых моцных шашыстаў-юніёраў свету. Цяпер Віталь Аніська здае экзаменацыйную сесію, бо з'яўляецца студэнтам 3-га курса геаграфічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Падрабязнасці пра яго выступленне на чэмпіянаце свету чытайце ў наступных нумарах "ГС".

Сяргей ЁРШ

В Слониме и районе — 860 безработных

На 1 декабря 2000 года на учете в региональном центре занятости по городу и району было зарегистрировано 860 человек, что на 7 человек меньше по сравнению с таким же периодом прошлого года.

Свободных рабочих мест на предприятиях для этих людей было всего лишь 65. А пособие по безработице на сегодняшний день составляет от одной до двух минимальных зарплат. Напомним, что одна минимальная зарплата — 3600 рублей.

Ольга ШИНКЕВИЧ

Фабрыцы "Тэкстыльшчык" — 55 год

У сувязі з юбілеем фабрыкі "Тэкстыльшчык" 575 пенсіянерам і 510 працаўнікам гэтага прадпрыемства выдаюць каштоўныя падарункі — ручнікі, пашытыя спецыяльна да гэтага свята.

Фабрыка "Тэкстыльшчык" была арганізавана 1 кастрычніка 1960 года на базе зліцця дзвюх арцеляў: "Бальшавік" і "1 мая". Гэтыя арцелі пачалі дзейнічаць з верасня 1945 года. Тады там працавалі 120 чалавек.

У розны час на фабрыцы працавалі сямейныя дынастыі Берастоўскіх, Панчанка, Барысікаў, Дрэка, Балашовых, Гародка, Борысаў, Герасімчыкаў і іншых.

Вольга ШЫНКЕВІЧ

АФІША•АФІША•АФІША

МіР

29 снежня — "Анастасія" (мультфільм) сеанс у 14.00.
"Затоплены" (баявік) сеансы ў 18.00, 19.00, 21.00.
30 снежня — "Маленькая чараўніца" сеанс у 14.00.
"Прах да праху" (баявік) сеансы ў 17.00, 19.00, 21.00.
31 снежня — "Карнавал монстраў" (мультфільм) сеанс у 14.00.
"Дырэктар" сеансы ў 17.00, 19.00.

Мерапрыемствы, якія будуць праходзіць у Слоніме ў святочныя дні:

28 снежня ў 12.00 у РДК — Мэраўская гарадская ёлка.
29 снежня ў 11.00 у РДК — Мэраўская раённая ёлка.
29 снежня — 2 студзеня — дыскатэка ў РДК.

ІНТЭРВ'Ю

"НАШ ЛЁС ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС"

За некалькі дзён да пачатку Новага 2001 года і новага стагоддзя я звярнуўся з традыцыйным пытаннем да вядомых слонімцаў, якія жывуць у Мінску і ў Гродне: што чакаеце ад Новага 2001 года і новага стагоддзя? Адказы атрымаліся розныя, але аб'ядноўвае іх адно: каб хутчэй беларусы сталі, як пісаў Янка Купала, "людзьмі звацца".

Уладзімір Ягоўдзік, *пісьменнік, рэдактар часопісаў "Бярозка" і "Лесавік":*

— Хачу, каб усе мы былі здаровымі і шчаслівымі. Каб нашы бацькі і дзеці таксама былі шчаслівыя. А нехрысцяў усё роўна чакае пекла.

Мікола Бушчык, *мастак:*

— Перш за ўсё хочацца, каб лепш жылі нашы людзі, а Беларусь стала нарэшце еўрапейскаю краінаю: адкрытай, багатай, з добрымі намерамі простых людзей і кіраўнікоў усіх рангаў. Каб лёс беларускага мастацтва цікавіў уладу. А слонімцам жадаю толькі здароўя!

Янка Саламевіч, *літаратуразнавец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі:*

— Найперш хачу пажадаць у новым годзе сабе і ўсім землякам моцнага здароўя. А яшчэ я чакаю ў наступным годзе выхаду ў свет свайго "Слоўніка беларускіх псеўданімаў". Над ім я працаваў шмат гадоў. Дарэчы, у слоўніку будуць псеўданімы слонімскіх журналістаў і літаратараў.

Уладзімір Сакалоўскі, *кандыдат філалагічных навук, перакладчык:*

— У новым годзе чакаю і спадзяюся на сваю плённую працу над трохтомнай кнігай, якую я пішу ў Беларусі і Германіі. Яна будзе прысвечана беларуска-нямецкім культурным сувязям на працягу 1914-1941 гадоў. Першая кніга ўжо выйшла з друку. Што датычыць стагоддзя, дык лёс Беларусі залежыць ад саміх беларусаў. Калі мы хочам быць багатымі і шчаслівымі, дык трэба неяк па-іншаму глядзець на тое, што адбываецца вакол нас.

Мікалай Ягаўдзік, *доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі РБ:*

— Перш за ўсё хацелася б, каб новы год быў лепшым, чым стары. І самае галоўнае, каб не пакідала нас здароўе. А XXI стагоддзе для Беларусі няхай будзе больш спакайнейшым і мірным, чым XX стагоддзе. І каб людзі жылі лепш, чым цяпер.

Аляксандр Талерчык, *краязнавец:*

— Шаноўныя сябры! Віншую з Новым годам, з Новым стагоддзем, з Новым тысячагоддзем!

Хай свецiць Вам шчасце
Калядною зоркаю.
І доля з гарэлкаю
Хай будуць не горкімі.

Сяргей ЧЫГРЫН

ОПРОС

"НА ЧТО ВЫ НАДЕЕТЕСЬ В НОВОМ ГОДУ?"

Алла Альбертовна Мартынова, *инженер:*

— На счастье в новом году надеемся, что жизнь изменится в лучшую сторону.

Игорь Самсончик, *рабочий:*

— Надеюсь на удачу, на то, что жить будем лучше. А еще надеюсь сам на себя, больше не на кого надеяться.

Семья Суходоловых:

— Мы надеемся закончить институт. Хотелось бы, чтобы наш маленький сынишка был здоровенький, чтобы лучше жили люди.

Юрий Саванец, *учащийся:*

— Я надеюсь на лучшее, чтобы все было хорошо.

Мария Алексеевна, *пенсионерка:*

— Я надеюсь, что все будут здоровы в новом году.

Денис, Юрий, *рабочие:*

— Хотелось бы чуточку везения в новом году.

Юлия, Наталья, *сотрудницы фотостудии:*

— Мы верим, что все будет хорошо. Здоровья бы хотелось, успехов в работе.

Вера Лисовская, *работница парикмахерской:*

— Чтобы на работе и в семье все было хорошо. Хочется, чтобы все были счастливы, здоровы. Всего самого-самого хорошего жду в новом году.

Ольга ШИНКЕВИЧ, Виталий ГИЛЬ (фото)

ІНТЭРВ'Ю

ЖДЕМ ЛУЧШЕЙ ЖИЗНИ

Чего вы ждете от 2001 года? С таким вопросом обратились к жителям Слонима ребята из кружка "Юный журналист". Вот, что они услышали:

Тамара Петровна Скворцова, *пенсионерка:*

— Жду лучшего материального благосостояния нашего народа.

Наталья Пудило, *ученица СШ N8:*

— Всего хорошего и побольше.

Наталья Горбун, *мастер фабрики "Гостиничная мебель":*

— Хочется иметь много денег и здоровья.

Сергей Сипаков, *ученик СШ N2:*

— Верю, что изменится экономическая и политическая ситуация в Беларуси. От столетия жду появления новых технологий и развития белорусской промышленности.

Валентина Иосифовна, *медсестра детской поликлиники:*

— Хочу, чтобы было у людей здоровье, и каждая семья летом отдыхала на юге.

Александр Григорьевич Петрищев, *пенсионер:*

— Чтобы больше платили денег, но и была реальная зарплата согласно ценам.

Андрей Кузнецов, *безработный:*

— Все ждут много чего, а получают то, что имеют.

Денис Марчук, *ученик СШ N8:*

— Чтобы родители получали хорошие зарплаты. Хочу иметь много друзей. Не хочу видеть бомжей. Чтоб у каждого была машина и образование.

Анна Петровна Синяк, *директор СШ N2:*

— Пусть наша школа станет школой искусств, а в классах чтобы были компьютеры. Надеюсь создать настоящий коллектив единомышленников.

Опрос провели Олеся КАХНОВСКАЯ, Инна МОЙСЕЙЧИК, Елена МАКАРОВА, Павел УСОВИЧ

НАВІНЫ

Замест "Майстра"

23 снежня ў Слонімскім РДК адбыўся вечар адпачынку пад назвай "Як добра, што сёння ўсе мы тут сабраліся".

Гэты вечар стаў пачаткам новай музычнай дыскатэкі для моладзі. Правялі яе прадстаўнікі мінскай фірмы "Шо Мона Полі".

Дыскатэка пад назвай "Майстар", якая працавала ў РДК раней, сваё ўжо "адгуляла". Цяпер па пятніцах, суботах і нядзелях у Доме культуры будзе іншая дыскатэка. Для яе закуплена новая гукавая апаратура і мэбля агульным коштам каля 10 тысяч даляраў.

Сяргей ЧЫГРЫН

Фермер займаецца рыбаводствам

У Дзятлаўскім раёне зарэгістравана чарговае ўнітарнае прыватнае прадпрыемства "Фермерская гаспадарка Наталлі Копач".

Яно знаходзіцца ў вёсцы Івязянка. Асноўны від дзейнасці гэтага прадпрыемства — рыбаводства.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

У падарунак — більярдны стол

Беларуская рэспубліканская асацыяцыя більярдыстаў падаравала слонімскай більярднай, якая дзейнічае пры РДК, більярдны стол коштам пяць тысяч даляраў.

Гэты падарунак слонімскія більярдысты атрымалі за паспяховае выступленне на рэспубліканскіх спаборніцтвах у Брэсце, дзе нашы ігракі занялі другое месца.

Сяргей ЧЫГРЫН

Гастроляў не будзе

У Казлоўшчынскім доме культуры, што ў Дзятлаўскім раёне, ёсць тэатр. Яго арганізавала мастацкі кіраўнік Надзея Сіўко.

Тэатр паставіў некалькі спектакляў. З дзіцячай пастаноўкай "Дзякуй, вялікі дзякуй!" па п'есе А.Вярцінскага тэатр удзельнічаў у абласным фестывалі. Выступленне было паспяховым. Выканаўца галоўнай ролі (Рыгоркі - яснай зоркі) артыст Дзмітрый Цярэшка, які працуе шэф-кухарам у ПТВ-191, узнагароджаны прызам за лепшую мужчынскую ролю.

Трупа тэатра марыць пабываць на гастролях у вёсках Дзятлаўшчыны. Але для гэтага трэба грошы, а іх няма.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Вёска будзе з музыкай

З бюджэту Слонімскага райвыканкама выдзелены сродкі для набыцця музычна-узмацняльнай апаратуры для сельскіх устаноў культуры.

Такую апаратуру ў гэтым годзе закупілі 12 клубаў раёна. Напрыклад, у Новых Дзявяткавічах з'явіліся калонкі і ўзмацняльнікі, для Бабыніцкага і Хадзявіцкага клубаў набылі магнітафоны і г.д.

Сяргей ЧЫГРЫН

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі:
231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
.........(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

Падпісана да друку 27 снежня 2000г.
Час падпісання 7:00.
Надрукавана ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)
Наклад 9700 экз.
Заказ № 3912

НАВІНЫ

Дэпутат пачаў працаваць

На апошняй сесіі Савета народных дэпутатаў Мастоўскага раёна выступіў дэпутат Палаты прадстаўнікоў ад Мастоўскай выбарчай акругі Генадзь Дылеўскі.

Ён паведаміў, што падчас яго першага прыёму ў якасці дэпутата Палаты звярнуліся 70 чалавек. – У сваёй большасці іх праблемы вырашальныя, – сказаў дэпутат, – але чыноўнікі на месцах марудзяць справу.

Надалей Генадзь Дылеўскі паабяцаў узяць пад свой асабісты кантроль дзеянні гэтых начальнікаў.

Антон МАКЕЙ

Няма калгаса, не будзе і сельсавета

У Мастоўскім райсавеце падрыхтаваны адпаведныя дакументы і накіраваны для зацвярджання ў Мінск аб скасаванні Малькавіцкага сельскага савета.

Вясною гэтага года быў ліквідаваны калгас "Зара", што знаходзіўся на тэрыторыі дадзенага сельсавета. Зараз вырашаецца лёс і самой адміністрацыйнай адзінкі. Большасць населеных пунктаў адыдзе да Мастоўскага сельсавета, за выключэннем вёсак Чарлёнка, Займішча ды Рыбакі. Яны павінны належаць Курылавіцкаму сельсавету. Дарэчы, да 1939 года гэтыя вёскі адносіліся да Курылавіцкай гміны Слонімскага павета.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Сумесныя крыжы

У гонар 2000-годдзя Хрысціянства на памежжы вуліц 30 гадоў ВЛКСМ і праспекта Юнацтва ў Мастах былі ўстаноўлены праваслаўны і каталіцкі крыжы.

Між імі пакладзены камень з надпісам, у гонар якой даты гэта зроблена. Крыж знаходзіцца на аднолькавай адлегласці ад праваслаўнага і каталіцкага храмаў. Такім чынам гэта сімвалізуе асаблівасць горада, дзе жывуць, у асноўным, вернікі дзвюх канфесій.

Антон МАКЕЙ

В Беларуси худший показатель

У Беларуси один из худших показателей в ежегодном обзоре политических и экономических свобод в 28 странах Восточной Европы и бывшего СССР, который проводится американской негосударственной организацией Freedom House.

Из 28 стран региона только три попали в наихудшую категорию классификации по политическим свободам – "консолидированные автократии" – это Беларусь, Туркменистан и Узбекистан. В категории "консолидированная государственная экономика" к этим странам присоединились Босния и Таджикистан.

Интересно, что наибольший рост валового внутреннего продукта наблюдается именно в странах региона с государственной экономикой. У Беларуси этот показатель (в среднем 4,9 процента в 1998 и 1999 годах) выше, чем у большинства стран региона, хоть и значительно уступает показателям Туркменистана (10,6 процента) и Боснии (15 процентов). При этом Беларусь вместе с Россией имеет один из низших годовых уровней иностранных инвестиций на душу населения в регионе в 1998–1999 годах (16 долларов США).

БелаПАН

ПОМНІК ЛЬВУ САПЕГУ ПАВІНЕН З'ЯВІЦЦА Ў СЛОНІМЕ... У НАСТУПНЫМ СТАГОДДЗІ

Ідзе ўжо трэці год, як Слонімскі гарвыканкам сваім рашэннем падтрымаў ініцыятыву групы гараджан аб пабудове і ўстаноўцы ў Слоніме помніка канцлеру Вялікага княства Літоўскага, старосце слонімскаму Льву Сапегу (1557 — 1633).

Нагадаем, што "ГС" на працягу 1998-2000 гадоў неаднаразова ўздымала гэтую тэму. У рэшце рэшт высветлілася, што існуе пяць стаўленняў да пытання ўстаноўкі помніка Сапегу: скульптара Івана Міско, фонда імя Сапегі ў асобе яго старшыні Міраслава Кобасы, слонімскага гарвыканкама, ініцыятыўнай групы слонімцаў і саміх жыхароў горада. Усім ім не хапала самага галоўнага – паразумення. Таму праект апынуўся ў "замарожаным" стане...

Нядаўна зноў з'явілася надзея, што помніку ўсё ж у Слоніме быць. Праўда, ужо ў наступным стагоддзі...

Старшыня ініцыятыўнай групы Таццяна Кажанкова на мінулым тыдні пабывала ў Мінску, дзе па справе помніка сустракалася з Міраславам Кобасай, які ў сваю чаргу звязаўся са скульптарам Іванам Міско. Пасля перамоваў Міско даў згоду змяніць праект. Рэч у тым, што раней спрэчкі разгараліся з-за таго, што на эскізе побач з Сапегай з'явіўся... сабака. Пасля гэтага кошт помніка павялічыўся ў два разы! Цяпер жа была дасягнута дамова аб сустрэчы кіраўніцтва Фонда імя Сапегі са скульптарам Міско пасля навагодніх святаў. Падчас яе будуць абмеркаваны спрэчныя моманты. Потым мусіць адбыцца іх сустрэча з кіраўніцтвам Слоніма.

У выпадку, калі канчаткова будзе дасягнута паразуменне паміж зацікаўленымі бакамі, магчыма ў наступным годзе адбудзецца прэзентацыя праекта помніка ў Слоніме. Пасля гэтага можна будзе адкрываць рахунак і збіраць грошы на яго стварэнне і ўсталяванне.



Трэба сказаць, што слонімскія ўлады па-ранейшаму прыхільна ставяцца да помніка. Напрыклад, галоўны архітэктар горада Уладзімір Казырновіч сказаў, што "пазіцыя ўладаў у дачыненні да гэтай праблемы нармальная. Помнік трэба ставіць". Тым больш, гарадскія ўлады рыхтуюцца святкаваць у 2002 годзе юбілей Слоніма, і адкрыццё помніка Льву Сапегу магло б значна ўпрыгожыць гэтае мерапрыемства.

Аднак, па словах Івана Міско, з якім карэспандэнту "ГС" удалося звязацца па тэлефоне, да ўсталявання помніка трэба яшчэ "правесці і рэканструкцыю сквера на плошчы Леніна" (менавіта там было вырашана ўсталяваць помнік Сапегу). Міско лічыць, што "павінен быць распрацаваны праект па добраўпарадкаванню сквера, у якім трэба пазначыць нават, дзе павінна расці асобнае дрэва і г. д. Дагэтуль нічога не зроблена, бо ў гарадскім бюджэце на гэтыя мэты няма грошай".

Сяргей ЁРШ

У СІМВАЛІЧНАСЦЬ ЛІЧБАЎ ВЕРУ

У сімвалічнасць лічбаў я веру. 2001-шы! Хай сэнсавай пусткай глядзяцца ў ім два нулі, але сума дзвюх другіх крайніх лічбаў – тры! "Усё, што ў тройцы, прыгожае", – гавараылі людзі антычнасці, рымляне. Чалавек Адраджэння XX стагоддзя, я, аднойчы доктар навук, аднойчы член-карэспандэнт НАН Беларусі, як некалі двойчы доктар навук Францішак Скарына, па-адраджэнцку веру ў прарочасць і лёсаноснасць сімвалічнае лічбы "тры".

Для беларусаў, для Беларусі, якая гістарычна стала Радзімай не толькі для беларусаў, але і для вялікай колькасці расіянаў, для палякаў, украінцаў, яўрэяў, татараў і іншых, запаветнае "тры" у XXI стагоддзі – гэта трэці раз, трэці круг, трэцяя мажлівасць. І я веру, што трэці захад шматнацыянальнай Беларусі на сваю адзіную нацыянальную дзяржаву будзе выдатны, будзе паспяховы, пераможны!..

Меч нам не даў вызвалення, непадлегласці, як ён даў іх Італіі Джузэпэ Гарыбальдзі, Польшчы Юзафа Пілсудскага. Наш Кастусь Каліноўскі са сваімі паўстанцамі 1863 года быў пераможаны. І гэта сімвалічна, што Францішак Багушэвіч, шараговы баявы штык Кастуся Каліноўскага – штык памяняў на пяро, – Адам Міцкевіч пяро мяняў на штык, а тут – наадварот: свой лёс, свая наканаванасць выпалі беларускаму мастацтву, народнаму, прыгожаму слову.

Але ў чым, уласна, прыхаваны быў гэты лёс, гэта назначэнне, відаць, Божае, беларускага слова, беларускай літаратуры? А ў тым, што паказвае рэальная гісторыя нашага народа, нашай Беларусі. Беларускай Народнай Рэспублікі, абвешчанай 25 сакавіка 1918 года, не было б, каб не было Францішка Багушэвіча – паэта, аўтара "Дудкі беларускай" і "Смыка беларускага", каб не было той народнай, пакутлівай і зорнай нашаніўскай пары ў нашай беларускай літаратуры, менавіта з яе ўявачалася БНР, на чале якой стаяў і выдатны літаратар Вацлаў Ластоўскі, як, хоць і меш значны літаратар Цішка Гартны, ды і ён, літаратар-нашанівец стаяў першым на чале БССР, якое таксама не ўзнікла б, каб не падмурак беларускага нашаніўства.

А суверэннасць Беларусі 1991 года? Што яе нарадзіла, вынасіла, кажучы словамі Якуба Коласа, "як носіць маці няясны воблік той дзіцяці"? Ізноў жа – літаратура, беларуская літаратура, – не вайскоўцы, не палітыкі, не якія-небудзь партыі вынеслі яе на паверх гісторыі, паказалі Беларусь на свет цэлы.

І не азіраючца яны на сваю хрышчоную маці – беларускую літаратуру, якая ад свайго народа, ад народаў шматнацыянальнае Беларусі, бо не толькі беларусы тварылі беларускую літаратуру, бо і беларуска-польскія нашы пісьменнікі XIX стагоддзя Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Вінцук Дунін-Марцінкевіч, бо і беларускія яўрэі, як Змітрок Бядуля і Юлі Таўбін, бо і беларускія татары, як у XIX стагоддзі два Адамы Кіркор і Гурыновіч, у XX ст. – Сцяпан Александровіч.

На парозе трэцяга тысячагоддзя я думаю аб адным, я ўпэўнены ў адным: мастацкая сіла беларускай літаратуры, эстэтычны патэнцыял яе – народнасць і краса застаюцца залогам трэцяга вахаду Беларусі ў супольства народаў Еўропы, свету – выхаду рэальнага, сапраўды незалежнага, дэмакратычнага, самавітага. "Усё, што ў тройцы, выдатнае": у гэтую выснову веруў, веру і з патроенай надзеяй гляджу ў будучыню.

Алег ЛОЙКА

БОКС

ДУБЛЬ І ХЕТ-ТРЫК АЛЯКСЕЯ ВАЎЧАНА



19-23 снежня ў Мінску праходзіў адкрыты Кубак Беларусі па боксу, прысвечаны памяці заслужанага трэнера СССР Уладзіміра Качана і ветэранаў беларускага бокса.

Чарговую перамогу на гэтых спаборніцтвах атрымаў слонімец Аляксей Ваўчан (вагавая катэгорыя 51 кг). Кубак Беларусі па боксу Аляксей выйграў ужо трэці раз (да гэтага ён перамагаў у 1998 і 1999 гадах).

Трэба адзначыць, што сёлета ў кастрычніку Аляксей Ваўчан таксама атрымаў перамогу на чэмпіянаце Беларусі ў Магілёве. Такім чынам, у слонімскага спартсмена атрымаўся своеасаблівы дубль і хет-трык у адыходзячым годзе.

Віншуем спартсмена і яго трэнера Уладзіміра Пірожніка з гэтым дасягненнем і жадаем новых перамог на вялікім рынгу.

Алег ТАЧОНЫ

ШАШКІ

Жаночы чэмпіянат па шашках у Гродне

Слонімшчыну на спаборніцтвах прадстаўлялі дзве ўдзельніцы. 16-гадовая Ганна Барысік заняла другое месца (у 1997 г. яна была трэцяй).

З 3 па 7 студзеня 2001 года ў слонімскай СШ № 3 пройдзе 20-ты міжнародны дзіцячы камандны турнір на кубак "Залатая шашка". Удзел у ім прымуць каманды Беларусі, Латвіі, Малдовы, Расіі, Украіны, Эстоніі. Напомнім, што мінулы турнір праводзіўся ў Латвіі.

Алег ТАЧОНЫ

ЗДАРЭННІ

Бутылка взорвалась в руках

В городе Березовка Гродненской области при изготовлении самодельного взрывпакета пострадали трое подростков 1985—1986 годов рождения.

Поздно вечером 20 декабря двое из них были доставлены в хирургическое отделение Лидского территориального медицинского объединения с множественными ранениями ног, кистей рук и лиц осколками стекла; с аналогичными ранениями в больницу города Березовка поступил их одноклассник.

Выяснилось, что подростки в подвале одного из жилых домов пытались изготовить взрывпакет. Взрыв произошел во время смешивания компонентов – окиси свинца и алюминиевой пудры – в стеклянной посуде. Эти вещества были похищены во время занятий в учебно-производственном комбинате, расположенном на территории стеклозавода "Неман".

Пагоня са стрэламі

Днямі супрацоўнікі мастоўскага ДАІ вырашылі спыніць ноччу ў горадзе аўтамашыну для праверкі дакументаў, але кіроўца не падпарадкаваўся.

Распачалася пагоня. Спробы спыніць машыну на вуліцах горада не прынеслі поспеху. Калі ўцякач з межаў горада выскачыў у накірунку вёскі Масты Правыя, міліцыянеры прымянілі зброю. Параўняўшыся з аўтамабілем уцякача, яны прастрэлілі кола. Толькі пасля гэтага парушальнік спыніўся. Высветлілася, што кіроўца быў не толькі моцна п'яны, але ў салоне яго аўтамашыны знаходзілася партыя алкагольных вырабаў без акцызных марак.

Антон МАКЕЙ

З гаража ўкралі аўтамабіль

У раёне г. Слоніма з прыватнага гаража невядомыя сарвалі замкі і ўгналі аўтамабіль.

Знікла касілка

На сенажаці саўгаса "Маладая гвардыя" рабочыя пакінулі касілку з восені.

Там яна прастаяла некалькі месяцаў і нікому не была патрэбна. А нядаўна гэты агрэгат знік. Прыйшлося дырэкцыі гаспадаркі па дапамогу звярнуцца ў міліцыю.

Украдзенае не схаваеш

У вёсцы Касцяні Слонімскага раёна ў мясцовага жыхара мужчына ўкраў газавы балон і два мяхі збожжа.

Міліцыя злодзея затрымала.

Выратавалі пажарныя

У адной з кватэр шматпавярховага дома на Брэсцкай вуліцы Слоніма трохгадовы Арцём І. падпаліў пасцельную бялізну.

Адбылося моцнае задымленне памяшкання. На дапамогу пацярпеўшым своечасова прыйшлі пажарныя і выратавалі хлопчыка і яго бабулю.

Сяргей ЧЫГРЫН

ДЕПУТАТАМ НУЖЕН СВОЙ БЮДЖЕТ

Депутаты Палаты представителей хотят, чтобы Национальное собрание имело собственный расчетный счет. Этот вопрос активно обсуждался парламентариями 19—20 декабря во время утверждения сметы расходов Палаты представителей на 2001 год.

В настоящее время финансирование парламента осуществляется через Управление делами президента Беларуси. Как отметил, представляя смету парламентариям, руководитель секретариата Палаты представителей Анатолий Чурсин, это не позволяет самостоятельно распределять материальные и технические ресурсы, выделяемые бюджетом на содержание Национального собрания. При этом Анатолий Чурсин отметил, что этих средств из года в год не хватает. Так, по его словам, на 2001 год заявка парламента удовлетворена Министерством финансов только на 43,5 процента. Из запрошенных Национальным собранием 5 миллиардов 155 миллионов рублей в бюджете заложено 2 миллиарда 243 миллиона (67 процентов — на финансирование Палаты представителей, а 33 процента — на содержание Совета Республики). Из-за недостаточности ассигнований смета расходов будет исполняться с большим напряжением, как это имело место и в текущем году, считает руководитель секретариата.

Необходимо отметить, что вопрос о финансовой самостоятельности парламентский корпус рассматривает как часть мероприятий, направленных на поднятие авторитета законодательной ветви власти. В частности, депутат Владимир Новосяд заявил, что трудно надеяться на признание парламента, который даже не имеет "собственной бухгалтерии". Недовольны депутаты и заложенной в бюджете суммой расходов, а также слабым материально-техническим обеспечением, в частности нехваткой компьютеров и бумаги. По словам депутата Александра Чечоры, если от них требуют работать в Палате представителей на постоянной основе, необходимо создать условия для профессиональной деятельности. В связи с этим Владимир Новосяд предложил инициировать вопрос о продлении срока перехода депутатов на постоянную работу в парламент с трех месяцев до полугода, если эти вопросы не будут решены в ближайшее время.

Юрий ПОТЕМКИН

УКАЗЫ РАСТУТ, КАК ГРИБЫ, А ДЕНЕГ ВСЕ НЕТ

Днями вступил в силу указ президента Беларуси "О привлечении к ответственности должностных лиц, не обеспечивших своевременную и полную выплату заработной платы".

Премьер-министру Владимиру Ермошину указано на "недостаточность принятых правительством мер по обеспечению своевременной выплаты заработной платы и на необходимость использования всех возможностей для исправления создавшегося положения с ее выплатой".

За "ненадлежащее выполнение должностных обязанностей" объявлены выговоры ряду чиновников: вице-премьеру правительства А.Попкову, первому заместителю министра сельского хозяйства и продовольствия А.Прокопову, заместителю председателя Гомельского облисполкома О.Акушко, заместителю председателя Витебского облисполкома В.Бойкову и председателю комитета по сельскому хозяйству и продовольствию Минского облисполкома В.Луцкому.

Руководителям республиканских органов госуправления, объединений, подчиненных правительству, а также исполнительных и распорядительных органов поручено привлечь к дисциплинарной ответственности лиц, виновных в непринятии мер по своевременной и полной выплате зарплаты по ноябрь 2000 года включительно. Чиновники, допустившие нарушения сроков выплаты зарплаты за октябрь и ноябрь, должны быть освобождены от занимаемых должностей.

Органам, осуществляющим государственную регистрацию субъектов хозяйствования, поручено предъявить в хозяйственные суды иски о ликвидации субъектов, которые неоднократно или грубо нарушали законодательство в части выплаты зарплаты. Вопрос о привлечении к ответственности лиц, виновных в несвоевременной выплате зарплаты, согласно указу, должны рассмотреть и учредители организаций негосударственной формы собственности.

Совету Министров, облисполкомам поручено обеспечить в декабре выплату заработной платы за ноябрь и погасить в полном объеме задолженность по зарплате.

Контроль за исполнением указа возложен на Комитет государственного контроля (КГК).

В официальном комментарии КГК к президентскому указу сообщается, что основанием для принятия столь "жестких мер со стороны главы государства" стал рост задолженности по зарплате, которая по состоянию на 1 декабря составила 8,36 миллиарда рублей, увеличившись по сравнению с предыдущим месяцем в 2,4 раза. Наибольшая часть задолженности приходится на сельскохозяйственные предприятия — 76,4 процента от общей суммы. При этом самый высокий показатель задолженности в Гомельской (2,4 млрд. рублей), Витебской (2 млрд.) и Минской (1,8 млрд.) областях.

БелаПАН

БОЛЬШЕ ЗЕМЛИ — БОЛЬШИЙ НАЛОГ

Палата представителей Национального собрания Беларуси одобрила проект закона об особенностях налогообложения в 2001 году. Документ предусматривает внесение поправок в восемь действующих законодательных актов.

Наиболее значительным изменением является увеличение налога на прибыль предприятий с 25 до 30 процентов. Правда, необходимо отметить, что одновременно с этим отменяются либо сокращаются суммы отчислений в ряд республиканских фондов. Таким образом, общая налоговая нагрузка на предприятия в 2001 году должна сократиться на 1 процент.

Еще одно нововведение, которое коснется значительной части граждан, — увеличение земельного налога за пользование земельными участками, превышающими установленные нормы отвода, за пользование участками, предоставленными во временное пользование и своевременно не возвращенными государству, а также за самовольно занятые земельные участки. В частности, согласно проекту, налог на земельные участки, превышающие по площади установленные нормы отвода и выделенные до 1 января 2001 года, будет взиматься в двукратном размере. За земельные участки, предоставленные во временное пользование и своевременно не возвращенные, а также самовольно занятые либо превышающие по площади установленные нормы отвода и выделенные с 1 января 2001 года, земельный налог будет взиматься в 10-кратном размере. Следует отметить, что земельные нормы отличаются для сельских и городских жителей, дачных наделов и так далее.

Юрий ПОТЕМКИН

НОВЫЙ ГОД—НОВЫЕ СТИПЕНДИИ

Совет Министров Беларуси утвердил размеры государственных стипендий учащейся молодежи, которые будут действовать с 1 января 2001 года.

Согласно принятому постановлению, с начала будущего года именные стипендии всех видов составят: студентам высших учебных заведений — 17 тысяч рублей; учащимся средних специальных учебных заведений — 15 тысяч 500 рублей. Именные стипендии учащимся ПТУ со сроком обучения не более 10 месяцев, а также со сроком обучения не менее 10 месяцев при невозможности организации для них питания составят 9 тысяч 400 рублей.

Размеры учебных стипендий студентам высших учебных заведений установлены в сумме 8 тысяч 700 рублей; учащимся средних специальных учебных заведений — 7 тысяч 300 рублей; учащимся ПТУ — 4 тысячи 700 рублей.

Социальные стипендии студентам вузов составят 7 тысяч рублей; учащимся средних специальных учебных заведений — 5 тысяч 600 рублей; учащимся ПТУ — 2 тысячи 600 рублей.

Персональная стипендия Совета высшего учебного заведения студентам вузов за особые успехи в изучении отдельных дисциплин и научно-техническом творчестве установлена в размере 15 тысяч рублей.

БелаПАН

Заметалин не желает БТ-2

"Новый проект создания БТ-2 президент поручил Заметалину, который все время препятствовал его созданию".

Так сказал в интервью "Белорусской деловой газете" депутат Палаты представителей Национального собрания Беларуси Иван Пашкевич — бывший заместитель главы Администрации президента, который считается автором идеи создания второго национального телеканала.

По словам Пашкевича, разработкой концепции БТ-2 вначале было поручено заняться первому заместителю главы Администрации президента Владимиру Заметалину и бывшему председателю Национальной телерадиокомпании Республики Беларусь Григорию Киселю. Однако после прихода Пашкевича на работу в администрацию этот проект был поручен ему. "Пытаясь обсуждать идею создания второго телеканала с Киселем и Заметалиным, я понял, что оба они не хотят его создания. Кисель боялся, что у него появится конкурент, Заметалин не хотел этого по политическим причинам", — сказал в интервью Иван Пашкевич. Что же касается самого Пашкевича, то, как он считает, "быть европейским государством и иметь только один национальный телеканал — это позор для Беларуси".

По словам Пашкевича, изучив ситуацию, он пришел к выводу, что "государство не может взять на себя затраты по созданию нового телевидения", и поэтому занялся поисками инвесторов. Инвестор, готовый оказать "серьезную помощь", по словам Пашкевича, был найден — это российская телекомпания ТВ-6, готовая предоставить белорусской стороне 10 миллионов долларов США. Однако "Кисель и Заметалин отклонили предложенный проект под предлогом поиска новых инвесторов", сказал Пашкевич.

Чуть позже, по его словам, он нашел новых инвесторов, готовых вложить деньги в проект создания БТ-2. "Все это давало возможность начать новый телевизионный проект на достаточно высоком уровне", — сказал Пашкевич. Он также сообщил, что предлагал разместить БТ-2 на уже существующих в Беларуси сетях, "поскольку на создание новых ушли бы десятки миллионов долларов". Этот проект "по сути, был одобрен президентом", однако его реализация "вновь наткнулась на какое-то непонятное противодействие". "Я устал бороться с Владимиром Заметалиным и Григорием Киселем. Поэтому изъявил желание уйти с поста замглавы Администрации президента", — сказал Иван Пашкевич.

Наталья КУЛАГИНА

Деды морозы вышли на демонстрацию



Фота IREX/ProMedia

Шествием дедов морозов, снегурочек и ряженых начались утром 23 декабря в Минске праздничные рождественские и новогодние мероприятия.

От площади Независимости сказочная колонна прошла до Октябрьской площади, где председатель Мингорисполкома Михаил Павлов зажег главную столичную елку — сооружение высотой около 30 метров, состоящее из 70 отдельных елок.

Что хотят—то и творят

Руководство общественного объединения "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" (ТБМ) решительно протестует против принятия нового закона об образовании, который фактически узаконит процесс уничтожения белорусскоязычного образования.

Соответствующее заявление было принято и распространено после того, как секретариат ТБМ ознакомилось с проектом Закона об образовании, разработанном Национальным центром законотворческой деятельности при президенте.

Данный законопроект был направлен президентом в Палату представителей Национального собрания 3 апреля нынешнего года. В середине января 2001 года его планируется внести на рассмотрение парламентской комиссии по образованию, культуре, науке и научно-техническому прогрессу.

Как отмечается в заявлении ТБМ, новый проект Закона об образовании содержит ряд положений, которые расходятся с нынешним законодательством. Так, в отличие от действующей Конституции, которая гарантирует гражданам свободу выбора языка, воспитания и обучения, данный законопроект гласит следующее: "граждане имеют право на выбор языка обучения и воспитания в пределах возможностей, предоставляемых системой образования".

Авторы заявления выражают "чрезвычайное возмущение" тем, что текст проекта закона до сих пор не был опубликован в СМИ для широкого общественного обсуждения.

Марат ГОРЕВОЙ

НАВІНЫ

Кветкі на Новы год

Акрамя камерцыйных крамаў, якія забяспечваюць слонімцаў кветкамі, сваю прадукцыю на Новы год прапануе і спецсаўгас "Рышчыцы".

Як сказала карэспандэнту "ГС" галоўны аграном саўгаса Любоў Пракапчук, да навагодніх свят для жыхароў Слоніма і Баранавіч будзе прапанавана 2 тысячы хрызантэм і 5 тысяч гваздзікоў. Самы дарагі гваздзік каштуе 450 рублёў, а самае дарагая хрызантэма – 300 рублёў. Спецсаўгас мае свой магазін і ў Ваўкавыску. А вось з Зэльвай дамовіцца наконт рэалізацыі там кветак вельмі цяжка. З яе кіраўніцтвам немагчыма знайсці агульную мову, – сказала галоўны аграном спецсаўгаса "Рышчыцы" Любоў Пракапчук.

Слонімскі тэатр запрасілі да губернатара на маскарад

29 снежня калектыў Слонімскага беларускага драматычнага тэатра ўпершыню запрасілі ў Гродна на губернатарскую ёлку. Артысты выступяць там з казачным навагоднім прадстаўленнем.

30 снежня ў памяшканні тэатра адбудзецца апошні ў гэтым стагоддзі паказ новага спектакля для дарослых "Пакуль яна памірала" (пачатак у 18 гадзін). А 1 студзеня 2001 года артысты выступяць каля слонімскай ёлкі ў цэнтры горада.

Будзем з ёлкамі!

Так запэўніў карэспандэнта "ГС" інжынер аховы леса Слонімскага лясгаса Станіслаў Койпаш.

– Ёлкі ўжо можна купіць на тэрыторыях Альбярцінскага лясніцтва і ў нас, у лясгасе. Тыя, хто будзе саматужным спосабам высякаць дрэвы, будуць пакараны. Штраф за высечаныя ёлкі ў лесе вагаецца ад 2880 рублёў да 15000 рублёў, – сказаў Станіслаў Койпаш.

Сяргей ЧЫГРЫН

Ёлка без цацак

Навагодняя ёлка нядаўна ўстаноўлена на левабярэжнай частцы горада Масты.


Цікава тое, што на яе галінкі не павесілі ні адной цацкі. Высвятляецца, што ў камунальнікаў горада іх проста няма. У былы час некалькі гадоў запар тутэйшыя жыхары здымаюць з ёлкі ўсё, што можна, нават лямпачкі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

"Горад без цябе"

Пры фінансавай падтрымцы сяброў выйшла ў свет кніжка Сяргея Чыгрына "Горад без цябе".

У гэты паэтычны зборнік увайшлі лепшыя вершы пра каханне, напісаныя паэтам за апошнія 20 гадоў. Пасля "Шчырай Шчары" гэта другая паэтычная кніжка слонімскага аўтара, і яна, відаць, хутка



стане бібліяграфічнай рэдкасцю, бо наклад "Горада без цябе" – усяго 200 асобнікаў.

Мікола КАНАНОВІЧ

КАК ВСТРЕЧАЮТ НОВЫЙ ГОД В РАЗНЫХ СТРАНАХ МИРА



Фота Віталя Гіля

Эту главную новогоднюю ёлку доставили в Слоним 20 декабря.

В **Болгарии** с нетерпением ждут 12-го удара часов. В это время в домах на мгновение гаснет свет для новогодних поцелуев. Только после этого хозяйка начинает разрезать пирог с запеченными в нем сюрпризами. Если достанется монетка – жди богатства, веточка розы – любви. Такая же традиция распространена в **Румынии**, **Австралии**.

В **Дании** хозяйка подает в полночь на праздничный стол огромную миску сладкой рисовой каши, да не простой, а с секретом. Особенность этой каши в том, что на дно миски запрятан орешек (миндаль). Незамужние девушки, внимание! Если вам попадется орешек – на следующий год свадьбы не миновать. Всем остальным обещается просто счастливый новый год. Что само по себе тоже неплохо.

Жители **северной Индии** украшают себя цветами розовых, красных, фиолетовых или белых оттенков. В **южной Индии** матери помещают сладости, цветы, небольшие подарки на специальный поднос. Утром нового года дети должны с закрытыми глазами ждать, пока их не подведут к подносу.

В **Японии** существует традиция: перед Новым годом дарить открытки с изображением животного, которое соответствует этому году. Дарят также игрушки и сувениры. Одним из самых ярких украшений японского дома перед Новым годом является кадомацу ("сосна у входа"). Кадомацу – приветствие Божеству Новогоднего праздника – преимущественно изготовляют из сосны, бамбука, сплетенных рисовых соломинок. Украшают ветками папоротника и мандарина. Каждая деталь этого украшения имеет свое значение.

